№15 (258)
2009

# Права на волю

Праваабарончы бюлетэнь




Фота Charter97.org

Менск, 1 лістапада 2009 году.

## Шэсьце ў Курапаты...

У Дзень памінаньня продкаў, 1 лістапада, у Менску адбылося шэсьце ў Курапаты – месца масавых расстрэлаў ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў. Акцыя на "Дзяды" праходзіць у Беларусі штогод. Мерапрыемства ўвайшло ў гісторыю тым, што ў 1988 годзе менавіта ў гэты дзень адбыўся масавы антысавецкі мітынг, арганізаваны Беларускім Народным Фронтам. Даведаўшыся жудасную праўду Курапат, людзі прыйшлі ва ўрочышча, каб ушанаваць памяць тысячаў суайчыньнікаў, расстраляных у гэтым месцы ў час сталінскіх рэпрэсіяў. Тады ўпершыню за дзесяцігодзьдзі жыцьця ў складзе СССР і падпольнай барацьбы за незалежнасьць беларусы адкрыта ўзьнялі нацыянальны бел-чырвона-белы сьцяг.

Сёлета арганізатарамі шэсьця выступілі Беларускі Народны Фронт "Адраджэньне" і Кансерватыўна-Хрысьціянская партыя БНФ. Удзельнікі акцыі сустрэліся ў 10.30 каля Менскага гадзіньнікавага заводу. Многія прыйшлі з кветкамі, каб ускласьці іх ля мемарыяльных крыжоў, усталяваных дэмакратычнай грамадзкасьцю ў Курапатах.

У акцыі "Дзяды" узялі ўдзел кіраўнікі КХП БНФ Юрась Беленькі і Сяргей Папкоў, лідэры Партыі БНФ Лявон Баршчэўскі, Аляксей Янукевіч, Вінцук Вячорка, каардынатар грамадзянскай кампаніі "Еўрапейская Беларусь" Андрэй Саньнікаў, актывісты "Еўрапейскай Беларусі" Зьміцер Бародка, Яўген Афнагель, Павел Юхневіч, Максім Вінярскі, лідэр Маладога Фронту Зьміцер Дашкевіч, сустаршыня Партыі БХД Павел Севярынец, старшыня руху "За свабоду" Аляксандр Мілінкевіч і іншыя.

(Працяг на стар. 7)




Фота Charter97.org

## МЗС тут ні пры чым?..

**Праваабаронца з Баранавічаў Сяргей Гоўша нарэшце дамогся "ўцямнага" адказу на свае запыты ў Міністэрства замежных справаў Беларусі наконт таго, хто мусіць выконваць рашэньні Камітэту па правах чалавека.**

**Сяргей Гоўша зьвярнуўся да МЗС з пытаньнем, чаму не выконваецца рашэньне Камітэту па правах чалавека ААН адносна рэгістрацыі праваабарончага цэнтру "Вясна", чаму дзяржавай парушана і да гэтага часу не ўзноўлена яго, Гоўшы, права на свабоду асацыяцыяў. Па словах Гоўшы, згодна з законам, калі гэта не датычыцца МЗС, то яны павінны былі толькі ўказаць, да каго зьвярнуцца.**

**16 кастрычніка Гоўша атрымаў адказ на гэты запыт у Міністэрства замежных справаў РБ, падпісаны намесьнікам міністра МЗС Алейнікам. Намесьнік міністра паведаміў заяўніку, што абарона правоў грамадзянаў РБ на ўнутрыдзяржаўным узроўні ўваходзіць у кампетэнцыю іншых дзяржаўных органаў РБ, а рашэньні Камітэту па правах чалавека неабавязковыя для выканання дзяржаўнымі органамі Беларусі.**

**Тады праваабаронца падрыхтаваў яшчэ адзін зварот у МЗС, каб паведамілі, куды менавіта трэба зьвяртацца, каб пытаньне вырашылася станоўча.**

**І вось чарговая адпіска МЗС: "У сувязі з вашай заявай ад 20 кастрычніка 2009 году паведамляем, што пытаньне выкананьня меркаваньняў Камітэту па правах чалавека па справе №1296/2004, якое згадваецца ў вашым звароце, знаходзіцца ў кампетэнцыі судовых органаў Рэспублікі Беларусь па месцы Вашага жыхарства".**

**Вось так, маўляў, дамагайцеся выкананьня рашэньня Камітэту ААН па месцы жыхарства, у Баранавічах, а МЗС тут ні пры чым.**

**Нагадаем: праваабаронца Сяргей Гоўша быў адным з заснавальнікаў ліквідаванага ўладамі ў 2003 годзе праваабарончага цэнтру "Вясна". Па рашэньні Камітэту па правах чалавека ААН Рэспубліцы Беларусь было рэкамендавана аднавіць рэгістрацыю арганізацыі і выплаціць кампенсацыю за незаконнае скасаваньне рэгістрацыі. Камітэт прасіў дзяржаву-ўдзельніцу ААН апублікаваць ягоныя меркаваньні. Ні адно з рашэньняў Камітэту дзяржавай выканана не было.**

*Праваабарончыя матэрыялы можна таксама прачытаць на сайтах: www.spring96.org; www.charter97.org; www.baj.ru*

# "У мяне на вачах забіваюць майго сына"

## З просьбай пра памілаваньне Андрэя Жука зьвярнулася яго маці

Змагаючыся за жыцьцё свайго сына, маці Андрэя Жука спрабуе выкарыстаць усе магчымыя сродкі – як міжнародныя механізмы прававой абароны, так і індывідуальны зварот да прэзідэнта краіны. 10 лістапада Сьвятлана Жук праз сродкі масавай інфармацыі зьвярнулася да Аляксандра Лукашэнкі з просьбай пра памілаваньне сына, сьмяротны прысуд якому ўступіў у сілу пасьля разгляду касацыйнай скаргі ў Вярхоўным судзе.



Хэзэр МАКГІЛ і Сьвятлана

– Так, Андрэй вінаваты. Вядома, ён ня меў права ні пры якіх абставінах пазбаўляць жыцьця гэтых людзей. Але атрымліваецца, што ў мяне на вачах зараз забіваюць майго сына. І я не хачу і не магу з гэтым прымірыцца. І ён, і мы, ягоныя родныя, да скону сваіх дзён будзем вымольваць прабачэньне за гэты цяжкі грэх у сем’яў загінулых і ў Бога. І я буду прасіць прэзідэнта даць Андрэю шанец сваёй працай загладзіць сваю віну і заслужыць прабачэньне сем’яў пацярпелых, – патлумачыла сваё рашэньне Сьвятлана Міхайлаўна 11 лістапада падчас прэс-канферэнцыі ў Менску.

У мерапрыемстве таксама бралі ўдзел Валянцін Стэфановіч, прадстаўнік ПЦ "Вясна", які зьяўляецца адным з ініцыятараў кампаніі "Праваабаронцы супраць сьмяротнага пакараньня ў Беларусі", і Хэзер Макгіл, прадстаўнік міжнароднай праваабарончай арганізацыі Amnesty International, эксперт па Беларусі.

Падчас свайго выступу Хэзер Макгіл выказала меркаваньне міжнароднай праваабарончай супольнасьці наконт таго, што надышоў час, калі Беларусь павінна сказаць "Не!" такому бесчалавечнаму пакараньню.

– Адна з праблемаў – гэта менавіта пакуты, якія сьмяротная кара прыносіць сваякам вязьняў. Паводле рашэньня Камітэту па правах чалавека ААН, прынятага ў 1999 годзе, сакрэтнасьць, якой акутана сьмяротнае пакараньне ў Беларусі, на самой справе, у дачыненьні да сваякоў прыраўноўваецца да катаваньняў. Таму што чалавек, асуджаны да пакараньня сьмерцю, ня ведае, калі ён можа быць расстраляны, і сваякі таксама нічога не даведаюцца, нават дату. Гэта вельмі цяжкае выпрабаваньне для людзей. Гэта цяжка для вязьняў, якія кожную хвіліну чакаюць: калі расчыняюцца дзьверы – іх павядуць на сьмерць. Гэта жахліва для сваякоў, якія нічога ня ведаюць. Яны ня могуць разьвітацца з родным чалавекам, не атрымаюць яго цела і нават яго рэчы, ня будуць ведаць, дзе ён пахаваны, – акрэсьліла жудасную карціну Х. Макгіл.

Праваабаронца Валянцін Стэфановіч узяў слова пасьля таго, як Сьвятлана Жук зачытала свой зварот да прэзідэнта.

– Цяжка пасьля маці нешта казаць. Але гэта сітуацыя і паказвае сутнасьць сьмяротнага пакараньня. Фактычна зараз на вачах у маці і бацькі дзяржава павольна забівае іх сына. Зразумела, як бацькі яны зараз адчуваюць вялікі боль і страту, яны жывуць у чаканьні моманту, калі гэта можа здарыцца. Менавіта таму мы як праваабаронцы выступаем за ўвядзеньне мараторыю на сьмяротнае пакараньне ў нашай краіне і лічым, што такі час прыйшоў. З нагоды апошніх сьмяротных прысудаў – у адносінах да Андрэя Жука і Васіля Юзэпчука – накіраваныя скаргі ў Камітэт па правах чалавека ААН. І гэтыя скаргі прынятыя да разгляду. Мы, у сваю чаргу, накіравалі пісьмовы зварот у МЗС, МУС, Генеральную пракуратуру, Адміністрацыю Прэзідэнта і праінфармавалі іх пра тое, што звароты ў Камітэце зарэгістраваныя. І таму дадзеныя ведамствы, якія ў адпаведнасьці са сваімі службовымі паўнамоцтвамі, адказныя ў тым ліку і за выкананьне прысудаў, павінны адтэрмінаваць выкананьне прысудаў да моманту, пакуль скаргі ня будуць разгледжаныя Камітэтам па сутнасьці, – распавёў В. Стэфановіч.

# "Дзеды Марозы" атрымалі адказ з Генеральнай пракуратуры

У выпадку ўстанаўленьня дадзеных аб сістэмным удзеле ў незарэгістраванай арганізацыі, група Дзядоў Марозаў будзе прыцягнутая да адказнасьці. Пра гэта паведамляецца ў лісьце Генеральнай пракуратуры за подпісам начальніка аддзелу па наглядзе за захаваньнем правоў і свабодаў грамадзянаў П. У. Радыёнава.

Нагадаем, у кастрычніку група Дзядоў Марозаў добраахвотна здалася ў генеральную пракуратуру. Удзельнікі акцыі аднесьлі заяву, у якой ня толькі прызналіся ў дзейнасьці незарэгістраванай арганізацыі цягам шматгадовага перыяду, але і папрасілі даць прававую ацэнку іх "дзедамарознай справе". Маўляў, штогод Дзяды Марозы "арганізоўваюць сьвяткаваньні Калядаў і Новага году ў розных населеных пунктах Беларусі, распаўсюджваюць калядныя і навагоднія падарункі (у тым ліку сярод непаўнагадовых), выступаюць на сходах, у сродках масавай інфармацыі з віншаваньнямі й найлепшымі пажаданьнямі".

У лісьце да Дзедаў Марозаў супрацоўнікі пракуратуры ў чарговы раз нагадалі, што дзейнасьць незарэгістраваных грамадзкіх аб’яднаньняў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь забараняецца. А таксама адзначылі, што "пры ўстанаўленьні дакладных дадзеных аб сістэмным і арганізаваным удзеле грамадзянаў у незаконнай дзейнасьці незарэгістраванага грамадзкага аб’яднаньня" можа быць разгледжанае пытаньне аб прыцягненьні да адказнасьці.

Разам з тым, як заўважае юрыст Асамблеі НДА Юры Чавусаў, у сваім лісьце пракуратура не зьвярнула ўвагу на яўку з павіннай Дзядоў Марозаў. "Па сутнасьці, мы тут бачым простае выкладаньне нормаў беларускага заканадаўства аб грамадзкіх аб’яднаньнях. На мой погляд, пракуратура вырашыла не разглядаць прававую сітуацыю, якая паўстала ў выніку гэткай дэманстрацыі абсурднасьці артыкулу 193-1", – зазначыў Юры Чавусаў. "З іншага боку, – мяркуе юрыст, – пракуратура адзначае, што пры наяўнасьці сістэмнага і арганізаванага супрацоўніцтва грамадзянаў у незарэгістраваных арганізацыях праваахоўныя органы могуць прыцягнуць гэтых людзей да адказнасьці. Так што з фармальнага пункту гледжаньня пытаньне аб крымінальнай адказнасьці Дзедаў Марозаў напэўна зноў паўстане бліжэй да Новага Году".

# Андрэй ПАЧОБУТ:
# "Людзей прымушаюць адмовіцца ад удзелу ў Саюзе палякаў"

***У пераліку патрабаваньняў, выстаўленых міжнароднай супольнасьцю да афіцыйнага Менску падчас гэтак званага тэставага перыяду, фігуруе такі неабходны крок, як захаваньне правоў і свабодаў тых беларускіх грамадзянаў, якія адносяцца да нацыянальных меншасьцяў. Гэты пункт быў уведзены Еўрасаюзам з ініцыятывы польскага боку. Неабходнасьць такога патрабаваньня выкліканая складанай сітуацыяй, у якой апынуўся Саюз палякаў на Беларусі на чале з Анжалікай Борыс. Пра праблемы польскай нацыянальнай меншасьці распавядае старшыня Галоўнай Рады непрызнанага ўладамі Саюзу палякаў, журналіст, уласны карэспандэнт "Газеты Выборчай" Андрэй Пачобут...***


Андрэй ПАЧОБУТ.

***– Андрэй, ці зьмянілася сітуацыя з Саюзам палякаў на Беларусі?***

– Сітуацыя Саюзу палякаў на працягу апошняга часу не зьмянілася. Калі казаць пра пэўную перыядызацыю адносінаў уладаў да польскай нацыянальнай меншасьці, да Саюзу палякаў, то трэба адзначыць, што вельмі вострая фаза была ў 2005 – 2006 гадах. Тады арыштоўвалі людзей. Сілай захоплівалі Дамы польскія: туды ўваходзіў АМАП, выцягваў нашых актывістаў і ўводзіў прадстаўнікоў прадзяржаўнай структуры – людзей, якія пайшлі на супрацоўніцтва з беларускімі ўладамі.

Пасьля, у 2007 годзе, усталявалася такая сітуацыя: беларускія ўлады ведаюць, што не прызнаны імі незалежны Саюз палякаў існуе і зьяўляецца незарэгістраванай структурай, але яны нібыта пагаджаюцца з гэтым. Разам з тым, калі пачаўся дыялог Лукашэнкі з Захадам, былі нейкія саступкі ў галіне палітычных правоў – вызваленьне палітвязьняў, уключэньне ў дзяржсістэму распаўсюду дзьвюх газетаў – то гэта "лібералізацыя" ніяк не закранула Саюз палякаў.

І ўжо ў гэтым годзе, напрыклад, калі ў сакавіку праходзіў VII зьезд нашага Саюзу, была вельмі брутальная хваля ціску, якую можна параўнаць з 2005 годам. Людзей выклікалі ў ідэалагічныя аддзелы і КДБ, міліцыя затрымлівала тых, хто ехаў на зьезд. Адзінае што нікога з кіраўніцтва не арыштавалі, таму што было шмат журналістаў на зьезьдзе, шмат тэлекамераў і ўлады не рызыкавалі разагнаць зьезд ці неяк перашкодзіць у яго правядзеньні. Таксама ўсплёск быў у верасьні, калі адбываўся зьезд праўладнага Саюзу палякаў. Напярэдадні таксама аказваўся ціск на сябраў нашай арганізацыі з мэтай прымусіць іх гэтым разам удзельнічаць у зьезьдзе. Такія факты намі зарэгістраваныя, і польскі бок праінфармаваны пра тое, што адбывалася. Мы спадзяваліся, што пасьля двух такіх пікавых падзеяў, якімі былі гэтыя зьезды, сітуацыя вернецца да стану ўяўнага спакою, які існаваў у 2007 годзе. На жаль, гэтага не адбылося.

***– А што адбываецца цяпер?***

– Цяпер мы назіраем вельмі моцны ціск на сябраў нашага Саюзу ў Івянцы. Улады тэстуюць рэакцыю Захаду на тое, што адбываецца. Там зараз спрабуюць пераняць Дом польскі, які зьяўляецца ўласнасьцю Саюзу палякаў. Праўда, туды ўжо ня могуць увесьці АМАП, вывесьці нашых людзей і паставіць там сваіх (а ў 2005 – 2006 гадах у Гародні ў сядзібе Саюзу палякаў знаходзіўся пункт міліцыі з мэтай бясьпекі праўладнага кіраўніцтва). На адкрытыя рэпрэсіі яны ня могуць зараз пайсьці. Разам з тым праз міліцыю, КДБ, Камітэт дзяржкантролю аказваюць ціск, спрабуючы паўплываць на нашых актывістаў. Там праводзіцца шэраг праверак на падставе ананімных лістоў, але не знайшлі нават чалавека, які падпісаўся пад рознымі абвінавачваньнямі – у нібыта парушэньні фінансавай дысцыпліны і г. д. Гэтыя праверкі выкарыстоўваюцца для таго, каб прымусіць людзей адмовіцца ад удзелу ў нашым Саюзе, каб яны нібыта добраахвотна перайшлі ў праўладную арганізацыю.

***– З якімі асноўнымі праблемамі сутыкаюцца палякі, што жывуць у Беларусі?***

– Самая галоўная праблема – гэта навучаньне польскай мове. У школах, дзяржаўных навучальных установах шмат год назіраецца спад зацікаўленьня да навучаньня польскай мове. Улады тлумачаць гэта тым, што няма цікавасьці з боку людзей, таму і праблемы нібыта няма. На самай справе, ёсьць шэраг выпадкаў, калі людзі падаюць заявы пра тое, каб іх дзеці вывучалі ў школе польскую мову. Улады ж адмаўляюць магчымасьць таго, каб польская мова выкладалася ў школе як прадмет, і зводзяць усё да факультатываў. Факультатыў праводзіцца раз на тыдзень пасьля заняткаў, і зразумела, што ўзровень ведаў ад яго мінімальны. Напрыклад, на пачатку году такая сітуацыя была ў Індуры, гэта невялічкая вёска непадалёк ад Гродна. Там было 12 такіх заяваў. Адміністрацыя школы паразмаўляла з усімі бацькамі, якім сказалі, што навучаньне будзе адбывацца за кошт рускай мовы, што гэта дрэнна, паколькі няма будучыні і г. д. Пасьля такіх размоваў засталося шэсьць заяваў, якія былі праігнараваныя. У выніку вывучэньне польскай мовы было ўведзена як факультатыў. І такіх прыкладаў шмат на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, асабліва ў Гродзенскай вобласьці.

Акрамя таго, наш Саюз палякаў – гэта найвялікшая польская арганізацыя на Беларусі, і яе нелегальнае існаваньне істотна абмяжоўвае і культурніцкія правы палякаў Беларусі, і права на распаўсюд інфармацыі на роднай мове. Нашыя выданьні – часопіс "Магазын польскі" і газета "Глос з-над Немна" – зьяўляюцца нелегальнымі і распаўсюджваюцца таксама нелегальна. Калі супрацоўнікі міліцыі дзе-небудзь заўважаюць наш часопіс, яго заўсёды канфіскоўваюць. Мы лічым, што гэта галоўныя праблемы, з якімі сутыкаецца польская меншасьць у Беларусі.

***– Якую пазіцыю Вы асабіста займаеце ў пытаньні пра працяг санкцыяў у дачыненьні да беларускіх уладаў?***

– Сітуацыя ў Беларусі дастаткова складаная. Але бачна, што беларускія ўлады пачынаюць прыслухоўвацца, толькі калі пытаньне ставіцца жорстка. Калі пытаньне ставіцца размазана, размовы пачынаюцца на нейкіх паўтанах, яны ахвотна абяцаюць, але ніколі не выконваюць сваіх абяцаньняў. Таму я лічу, што ў дачыненьні да беларускага рэжыму трэба мець жорсткую пазіцыю. Гэта ня значыць, што ня трэба размаўляць. Трэба размаўляць так, як размаўляў з савецкімі лідэрамі, скажам, Рональд Рэйган. Яны сустракаліся, вялі перамовы, але гэта была годная і цьвёрдая, заснаваная на вартасьцях палітыка. І калі такую палітыку праводзіць у дачыненьні да Аляксандра Лукашэнкі, то яна прынясе плён. Калі гэта будзе нейкая гульня, нейкія спробы цывілізаваць… Гэта прыгожа гучыць – "цывілізаваць Лукашэнку", "выхаваць беларускіх чыноўнікаў". На жаль, увесь мой досьвед паказвае, што людзі ва ўладзе дастаткова добра разумеюць сітуацыю, але ёсьць жорсткая сіла, якая іх прымушае. І яны толькі іншую сілу разумеюць.

# Мініінфармацыі спыніць "дэзінфармаваньне"

Міністэрства інфармацыі Беларусі будзе спыняць любыя спробы дэзінфармаваць насельніцтва краіны. Пра гэта заявіла журналістам першы намесьнік міністра інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч, каментуючы ажыятаж у некаторых СМІ зьвязаны з захворваньнем на ВРВІ і грып, перадае БелТА.

"Што да працы сродкаў масавай інфармацыі, мы ўважліва аналізуем і ў адпаведнасьці з заканадаўствам будзем спыняць любыя спробы дэзінфармаваць грамадзян нашай краіны. Для гэтага сёньня досыць паглядзець ня толькі друкаваныя і электронныя СМІ, але мы зьвернем увагу і на інтэрнэт-версіі зарэгістраваных СМІ", – сказала Лілія Ананіч.

"Заява Мініінфармацыі гучыць як папярэджаньне медыя, – пракаментаваў прэс-службе БАЖ гэтую заяву намесьнік старшыні БАЖ Андрэй Бастунец. – У СМІ пачалі зьяўляцца дакументы, якія сьведчаць пра, мякка кажучы, няпоўнае інфармаваньне суграмадзян афіцыйнымі асобамі. Спробы супакоіць людзей шляхам дазаваньня інфармацыі, як бачым, ні да чаго не прыводзяць. І зараз улады спрабуюць выкарыстаць іншыя звыклыя механізмы – ціск на медыя і пагрозы".

На думку юрыста, "ажыятаж і паніку ствараюць не медыя, а гэтая практыка закрыцьця дзяржавай грамадзка значнай інфармацыі". "Адсюль ідзе недавер да афіцыйнай інфармацыі. Усё накіравана на тое, каб людзі атрымлівалі толькі тую інфармацыю, якая адцэнзуравана", – сказаў А. Бастунец у інтэрв'ю Радыё "Свабода".

"Апошнім часам мы наогул бачым у Беларусі тэндэнцыю закрыцьця інфармацыі дзяржаўнымі органамі ад СМІ. Яшчэ год таму былі ўнесены зьмены ў заканадаўства аб дзяржслужачых, якія забаранілі ім даваць каментар у СМІ без узгадненьня з кіраўніцтвам органа. На пачатку гэтага году зьявіўся ўказ прэзідэнта, які ўсе кантакты СМІ з дзяржаўнымі органамі, прадпрыемствамі зьвёў да сувязі праз прэсавых сакратароў і гэтак далей, якія падпарадкоўваюцца кіраўніку органа, дзейнасьць якіх маніторыць адміністрацыя прэзідэнта. Мы бачым, што ўсё накіравана на тое, каб людзі атрымлівалі толькі тую інфармацыю, якая адцэнзуравана і якая павінна быць карыснай для дзяржавы. Я думаю, гэта было зроблена ў зьвязку з эканамічным крызісам. Але мы бачым: калі мяняецца эпідэміялагічная сітуацыя, гэтыя нормы таксама могуць быць узгаданыя".

# Адмовілі ўжо шасьці выданьням

Міністэрства інфармацыі не зарэгістравала яшчэ адну недзяржаўную газету грамадзка-палітычнай тэматыкі – як мінімум шостую па ліку за апошнія тры месяцы. 10 лістапада заснавальнік рэгіянальнай газеты "Прэфект плюс" (г. Глыбокае, Віцебская вобласьць) атрымаў назад дакументы, накіраваныя 7 кастрычніка ў міністэрства для дзяржаўнай рэгістрацыі.

Дакументы вернутыя з той прычыны, што юрыдычная асоба (прыватнае выдавецка-рэкламнае ўнітарнае прадпрыемства "Прэфект-інфо"), на якую ўскладзеныя функцыі рэдакцыі газеты "Прэфект плюс", зарэгістраваная ў жылым памяшканьні, – паведамляецца ў афіцыйным лісьце ад 6 лістапада за подпісам намесьніцы міністра інфармацыі Ліліі Ананіч. "Выпуск жа газеты прадугледжвае ажыцьцяўленьне рэдакцыйнай вытворчай дзейнасьці", – даводзіць чыноўніца.

Л. Ананіч спасылаецца на п. 5 Палажэньня аб дзяржаўнай рэгістрацыі суб'ектаў гаспадараньня, зацьверджанага Дэкрэтам прэзідэнта № 1 ад 16.01. 2009 г. "Аб дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі суб'ектаў гаспадараньня". У дакуменьце вызначана, што ажыцьцяўленьне вытворчай дзейнасьці вымагае пераводу жылога памяшканьня ў нежылы фонд.

Адначасова ў выдавецтва "Прэфект-інфо" ўзьнікла праблема з юрыдычным адрасам ужо зарэгістраванай раней (28 жніўня 2009 г.) у гэтым жа жылым памяшканьні аднайменнай рэкламнай газеты ("Прэфект-інфо"). Зараз міністэрства прапануе ў месячны тэрмін "прыняць вызначаныя заканадаўствам меры па разьмяшчэньні рэдакцыі гэтага друкаванага сродку масавай інфармацыі ў нежылым памяшканьні".

"У прынцыпе, мы былі маральна гатовыя да таго, што ўзьнікнуць якія-небудзь праблемы з рэгістрацыяй, і будзем зараз спрабаваць іх вырашаць. Шчыра кажучы, мы б зьдзівіліся, калі б газету адразу зарэгістравалі", – зазначыў у гутарцы з БАЖ дырэктар выдавецкага прадпрыемства "Прэфект-інфо" Яраслаў Берніковіч.

З пачатку верасьня гэта году Міністэрства інфармацыі не зарэгістравала рэгіянальныя газеты "Солигорск плюс", "Новую газету Бобруйска", "Магілёўскі час", "Мар'інагорскую" і яшчэ некаторыя СМІ, заснавальнікі якіх не пажадалі быць згаданымі ў прэсе.

## На заводзе "Нёман" затрымалі журналістаў

Супрацоўнікі міліцыі 6 лістапада затрымалі на шклозаводзе "Нёман" у Бярозаўцы журналістаў Аляксандра Дзянісава і Аляксандра Хілімона. Журналісты рыхтавалі сюжэт пра сітуацыю на заводзе.

Аляксандр Хілімон паведаміў, што яго з калегам затрымалі ў той момант, калі яны пакідалі завод. Кіраваў затрыманьнем намесьнік дырэктара па рэжыму. Больш за гадзіну журналістаў трымалі на тэрыторыі заводу.

Алесь Дзянісаў – сябра Беларускай асацыяцыі журналістаў і Аляксандр Хілімон супрацоўнічае з "Обозревателем". Іх цікавіла сітуацыя на шклозаводзе "Нёман", працаўнікі якога выказваюць незадаволенасьць сваім становішчам. Журналісты атрымалі дазвол трапіць на прадпрыемства, але туды прыбылі міліцыянты.

Нагадаем, напярэдадні рабочыя шкозавода "Нёман" зьвярнуліся з лістом да міністра архітэктуры і будаўніцтва Аляксандра Селязьнёва. Рабочыя гуты "Нёман" пішуць, што зьвярнуцца іх прымусіла крытычная сітуацыя, якая склалася на прадпрыемстве. Пад лістом паставілі подпісы звыш тысячы рабочых.

## У Беларусь не пусьцілі...

**Агнешцы Рамашэўскай, якая зьбіралася па запрашэньні арганізатараў Менскага форуму XII прыехаць у Беларусь 4 лістапада, адмовілі ў беларускай візе. Гэтую інфармацыю яна пацьвердзіла 5 лістапада прэс-службе БАЖ. Па яе словах, адмовілі ёй без усялякіх тлумачэньняў.**

**Усе неабходныя для афармленьня візы дакументы, у тым ліку запрашэньне ад арганізатараў Менскага форуму XII, былі пададзеныя ў беларускую амбасаду тыдзень таму. На 4 лістапада ў спн. Рамашэўскай быў замоўлены квіток на самалёт, але ў 13.00 з беларускай амбасады прыйшла адмова. На форуме Агнешка Рамашэўска павінна была прысутнічаць у якасьці ганаровай госьці.**

**"Шчыра кажучы, мне здавалася, што гэтым разам я атрымаю візу хаця б на 2 дні – усё роўна за гэты час ніякай "рэвалюцыі" я б не зрабіла. Але я бачу, што тут ва ўладаў Беларусі вельмі цьвёрдая пазіцыя. Гэта ня можа быць выпадкова", – лічыць А. Рамашэўская.**

**"Мне здаецца, адмова ў візе сьведчыць пра тое, што і на рэгістрацыю прадстаўніцтва "Белсат" у Беларусі цяпер асабліва спадзявацца ня варта. І гэты факт, і тое, што кажа пра нас дзяржаўнае беларускае тэлебачаньне, я разумею як падрыхтоўку глебы для адмовы нам у рэгістрацыі", – зазначыла дырэктарка "Белсат" у гутарцы з БАЖ.**

**Упершыню "Белсат" падаў у МЗС дакументы на рэгістрацыю прадстаўніцтва тэлеканала як часткі Польскага тэлебачаньня (TVP) у Беларусі 20 сьнежня 2008 году. У лютым Міністэрства замежных справаў прыпыніла іх разгляд, спаслаўшыся на тое, што яны аформленыя неналежным чынам. Улетку "Белсат" паўторна зьвярнуўся ў МЗС па рэгістрацыю, але ў ліпені Міністэрства замежных справаў Беларусі паведаміла, што для рэгістрацыі зноў не хапае аднаго дакумента. Тэлеканал выправіў "недахопы" і цяпер зноў чакае на рашэньне МЗС.**

# Ігар Коктыш прызнаны вязьнем сумленьня

Як заявіла "Міжнародная амністыя" (Amnesty International), украінскія ўлады павінны неадкладна і безумоўна вызваліць беларускага музыканта і актывіста Ігара Коктыша, які ўжо больш за два гады знаходзіцца пад вартай за тое, што мірна выказваў свае погляды. Арганізацыя таксама запатрабавала, каб Ігара Коктыша не высылалі прымусова ў Беларусь, дзе, наколькі можна меркаваць, яму пагражае вынясеньне сьмяротнага прысуду па сфабрыкаваннай справе. "Міжнародная амністыя" прызнала Ігара Коктыша вязьнем сумленьня.

Ігар Коктыш знаходзіцца пад вартай з 25 чэрвеня 2007 году – з тых часоў як беларускія ўлады даслалі запыт аб яго экстрадыцыі на падставе непераканаўчых абвінавачваньняў у забойстве, якое адбылося ў Беларусі ў студзені 2001 году. Ён абвінавачваецца па артыкуле 139 Крымінальнага кодэксу Беларусі ў "наўмысным забойстве пры абцяжарваючых абставінах", якое караецца сьмерцю.

Ігар Коктыш дзесяць месяцаў правёў у баранавіцкім СІЗА. Як стала вядома, пад вартай да яго ўжывалі катаваньні, або жорсткае абыходжаньне. Для таго, каб прымусіць яго прызнацца, яго, акрамя іншага, зьбівалі і зачынялі голым у халоднай камеры, а таксама не давалі лекаў, прапісаных яму ад астмы.

Ігар Коктыш распавёў "Міжнароднай амністыі", што падчас заключэньня галоўны сьледчы Брэсцкага раёну сказаў яму, што ведае пра яго невінаватасьць, аднак на яго цісьне вышэйшае начальства. У судзе сьледчы адмовіўся паўтарыць свае словы. Ігар Коктыш здолеў даказаць, што на момант учыненьня злачынства знаходзіўся ў іншым горадзе. Суд апраўдаў і вызваліў яго. Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь зацьвердзіў гэты прысуд 1 лютага 2002 году.

Пасьля вызваленьня Ігар Коктыш пераехаў ва Украіну, дзе атрымаў від на жыхарства і дазвол на працу, а таксама пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай. У красавіку 2002 году Генеральная пракуратура Беларусі абскардзіла прысуд, і справу вярнулі на перагляд у суд. Затым Беларусь накіравала запыт на экстрадыцыю, і 25 чэрвеня 2007 году украінскія ўлады ўзялі Ігара Коктыша пад варту.

У кастрычніку 2007 году Ігар Коктыш зьвярнуўся ў Еўрапейскі суд па правах чалавека, каб аспрэчыць сваю экстрадыцыю ў Беларусь і затрыманьне для выдачы. Суд заклікаў улады Украіны не выдаваць яго ў Беларусь, пакуль суд не разгледзіць справу.

Ва Украіне Ігар Коктыш працягваў актыўна падтрымліваць беларускага кандыдата ад апазіцыі Аляксандра Мілінкевіча падчас прэзідэнцкай гонкі ў Беларусі ў 2006 годзе. Ён здымаў відэа, рабіў інтэрнэт-банэры і складаў песьні ў падтрымку кандыдата. Акрамя таго, ён стварыў сайт незарэгістраванага нефармальнага моладзевага руху, дзе разьмяшчаліся апазіцыйныя ўлёткі і плакаты.

Ва Украіне Ігар Коктыш зьвярнуўся



Ігар КОКТЫШ.

па статус бежанца, аднак 23 Кастрычніка 2008 году яго прашэньне адхілілі. У цяперашні час ягоны адвакат абскарджвае гэтае рашэньне ад імя свайго кліента.

Цэлы шэраг міжнародных канвенцыяў па правах чалавека, да якіх далучылася Украіна, забараняюць дэпартацыю і экстрадыцыю любых асобаў у тыя краіны, дзе ім можа пагражаць сьмяротная кара, катаваньні і іншыя віды жорсткага абыходжаньня.

У Беларусі музыкант з забароненага рок-гурту "Млечны шлях" Ігар Коктыш займаў актыўную сацыяльную і палітычную пазіцыю. Ён быў адным з заснавальнікаў моладзевай арганізацыі, створанай на сродкі каталіцкай царквы, якая займалася рэабілітацыяй маладых наркаманаў. Ігар Коктыш арганізоўваў рок-фестывалі пад дэвізам "Не – наркотыкам і гвалту!". Ён таксама зьяўляўся актыўным удзельнікам моладзевага апазіцыйнага руху "Зубр" (якое пасьля ліквідавалі) і шэрагу палітычных кампаніяў.

# Андрэй Бандарэнка спыніў галадоўку

Андрэя Бандарэнку, які галадае з 19 кастрычніка, 6 лістапада паклалі ў турэмны шпіталь. У рэспубліканскім турэмным шпіталі, куды паклалі Андрэя Бандарэнку, адмовіліся распавесьці пра тое, як пачуваецца вязень, спаслаўшыся на службовую інструкцыю. Наведаць Андрэя Бандарэнку супрацоўнікі шпіталю не дазволілі ягонай сястры Ірыне Бандарэнцы. Напярэдадні Ірына Бандарэнка атрымала дазвол на спатканьне ў судзе, але ў турэмным шпіталі ёй сказалі прыходзіць у сераду, калі ў шпіталі адбываецца планавая сустрэча медыкаў са сваякамі вязьняў.

У той жа дзень Андрэй Бандарэнка заявіў пра спыненьне галадоўкі. Пра гэта паведаміў адвакат Зьміцер Лаеўскі, які наведаў у рэспубліканскаім турэмным шпіталі свайго падабароннага: "Я перадаў Андрэю Бандарэнку зварот ягоных сваякоў і аднадумцаў, якія заклікалі яго спыніць гэтую акцыю ў сувязі з яе небясьпекай для ягонага здароўя. Апошнімі днямі ён сапраўды стаў пачувацца вельмі дрэнна, значна схуднеў. Гэтым і было выклікана тое, што яго тэрмінова паклалі ў турэмны шпіталь. У выніку ён прыняў рашэньне спыніць галадоўку, але працягвае патрабаваць справядлівага разгляду сваёй скаргі ў касацыйнай інстанцыі".

Лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька заявіў, што "прысуд Бандарэнку – гэта знак усім прадпрымальнікам Беларусі, якія хочуць актыўна займацца палітыкай".

На думку палітыка, бізнэсоўцам прад'явілі паказальны працэс. "Лукашэнка асабіста сказаў, каб прадпрымальнікі ня лезьлі ў палітыку. І ў гэтай сітуацыі ніхто не павінен быць раўнадушны да прысуду Андрэя Бандарэнкі", – падкрэсьліў А. Лябедзька.

"Мы будзем абараняць былога кандыдата ў дэпутаты Андрэя Бандарэнку гэтак жа, як у свой час дэпутатаў Андрэя Клімава і Уладзіміра Кудзінава, якія таксама трапілі ў турму па палітычных матывах. Для нас гэта – барацьба за справядлівасьць", – заявіў дэпутат Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь XIII скліканьня Аляксандр Дабравольскі.

"У свой час яны рызыкнулі падтрымаць ініцыятыву пра імпічмент прэзідэнта, зьяўляючыся прадпрымальнікамі і разумеючы сваю слабасьць, – нагадвае палітык. – І былі асуджаныя не за палітычную дзейнасьць, а за "гаспадарчыя злачынствы".

Нагадаем, Андрэй Бандарэнка быў асуджаны на сем гадоў турмы з канфіскацыяй маёмасьці паводле рашэньня суда Першамайскага раёну Менску. Гэтае рашэньне вынес судзьдзя Леанід Ярмоленкаў.

## Аўтуховіча і Асіпенку не выпускаюць

**Следства па справе ваўкавыскіх прадпрымальнікаў Мікалая Аўтуховіча і Уладзіміра Асіпенкі працягнута на месяц – да 8 сьнежня, паведаміў праваабаронца Алег Воўчак. "Мы меркавалі, што следства будзе падоўжанае. На маю думку, гэта значыць, што Аўтуховічу ўсё-ткі будзе прад'яўленае абвінавачаньне па артыкуле 359 КК Беларусі (тэрарыстычны акт). Але падаўжэньне тэрмінаў следства сьведчыць пра тое, што доказаў у дачыненьні да Аўтуховіча проста няма", – заявіў А. Воўчак.**

**Як паведаміў БелаПАН адвакат Мікалая Аўтуховіча Павел Сапелка, яго падабаронны пачуваецца "нармальна". "Я наведваў яго ў чацьвер, 5 лістапада. На здароўе ён ня скардзіўся. Мы настроеныя на тое, што хутка будзем знаёміцца з матэрыяламі справы. І я магу заявіць, што мы падыходзім да гэтага этапу, як кажуць, у поўнай баявой гатоўнасьці", – сказаў П. Сапелка.**

**Нагадаем: 8 лютага 2009 году ў Ваўкавыску (Гродзенская вобласьць) былі затрыманыя прадпрымальнікі Мікалай Аўтуховіч, Юры Лявонаў і Уладзімір Асіпенка. 18 лютага ім было прад'яўленае абвінавачаньне па арт. 218 КК. 23 чэрвеня ў дачыненьні да Аўтуховіча і, як паведаміла МУС, "іншых асобаў" была ўзбуджаная справа па арт. 359 КК (падрыхтоўка тэракту, арт. 13).**

# "Кароткачасовае" затрыманьне...

## Наста Палажанка паскардзілася на дзеяньні міліцыянтаў

Намесьніца старшыні Маладога Фронту Наста Палажанка накіравала заяву ў пракуратуру Першамайскага раёну Менску з нагоды незаконнага затрыманьня і ўтрыманьня ў РАУСе цягам 6 гадзінаў без падставаў на тое і незаконную канфіскацыю інфармацыйных матэрыялаў да кампаніяў Маладога Фронту.

"07.11.2009 г. каля 9 гадзінаў раніцы амаль на парозе майго пад'езду да мяне падышлі тры чалавекі ў цывільным адзеньні. Адзін з іх прадставіўся як маёр міліцыі Чалей А. А. і прапанаваў прысесьці разам з імі у міліцэйскую машыну (яна стаяла неадлёка, унутры знаходзілася двое людзей у міліцэйскай форме). Прычыну мне не патлумачылі, але непадпарадкаваньне і супраціўленьне я аказваць ня стала. Гэтыя людзі даставілі мяне ў РУУС Першамайскага раёну г. Менску.

На працягу трох гадзінаў мне не паведамлялі падставаў майго затрыманьня. Толькі пасьля гэтага тэрміну мне паведамілі, што я затрымана па падазрэньні ва ўчыненьні злачынства.

Якога канкрэтна злачынства, мне не патлумачылі. Згодна з ч. 1 арт. 108 Крымінальна-працэсуальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь ад 16 ліпеня 1999 г. №295-З (са зьменамі і дадаткамі) асоба, якая падазраецца ва ўчыненьні злачынства, можа быць затрымана органам крымінальнага пераследу, які дзейнічае ў межах сваёй кампетэнцыі, пры наяўнасьці адной з падставаў, пералічаных у п.1-4 гэтай часткі. У выніку я так і не зразумела, якія ж падставы былі насамрэч.

Да таго ж, ч. 1-2 арт. 110 Крымінальна-працэсуальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь прадугледжваюць, што "1. Неадкладна пасьля дастаўкі затрыманага ў орган крымінальнага пераследу службовай асобай, якая ажыцьцявіла фактычнае затрыманьне, складаецца пратакол, у якім паказваюцца падставы, месца і час фактычнага затрыманьня (з указаньнем гадзіны і хвілінаў), вынікі асабістага дагляду, а таксама час складаньня пратаколу. Пратакол аб'яўляецца затрыманаму і пры гэтым растлумачваюцца прадугледжаныя артыкулам 41 дадзенага Кодэксу правы, у тым ліку права запрасіць абаронцу і даваць паказаньні ў яго прысутнасьці, што адзначаецца ў пратаколе. Пратакол падпісваецца асобай, якая яго склала, і затрыманым.

2. Орган дазнаньня, сьледчы, пракурор на працягу трох гадзінаў з моманту дастаўкі падазраванага ў орган крымінальнага пераследу прымаюць рашэньне аб затрыманьні, пра што выносіцца пастанова, якая зьяўляецца прававой падставай для кароткачасовага ўтрыманьня пад вартай затрыманага ў месцах і на ўмовах, прадугледжаных законам, альбо прымаюць рашэньне аб вызваленьні затрыманага. Пастанова аб'яўляецца затрыманаму".

Хачу зазначыць, што пратакол затрыманьня не складаўся (ці мне не прадставілі яго), падставы майго затрыманьня так і не агучылі, але ў выніку асабістага дагляду быў складзены толькі Пратакол выманьня рэчаў і дакументаў (копія ў дадатку). Правы і абавязкі, адпаведна, ніхто не агучыў, права на абаронцу не прадставілі. Наконт пастановы аб затрыманьні хачу паведаміць, што са словаў міліцыянтаў рашэньне аб маім лёсе прымецца пасьля тэлефоннага званку, які мае адбыцца пасьля 15 гадзінаў дня. Каля таго часу пасьля тэлефоннага званку мяне адпусьцілі без тлумачэньняў і складаньня працэсуальных дакументаў. Міліцыянты пакінулі сабе тое, што было беспадстаўна адабрана і пералічана ў пратаколе выманьня:

1. Бланкі збору подпісаў – 500 экз. фармату А4;

2. Плакаты "Прапануем далучацца да агульнанацыянальнага збору подпісаў у абарону беларускай мовы" – 500 экзэмпляраў фармату А4;

3. Плакаты "Падаруй кнігу дзіцячаму дому" – 500 экз. Фармату А3.

На мае патрабаваньні аддаць гэтыя рэчы я атрымала адмову. Паколькі крымінальнай справы на мяне не заведзена і гэтыя рэчы не зьяўляюцца забароненымі і не нясуць нічога супрацьпраўнага, лічу адмову ў вяртаньні неправамернай.

На падставе вышэйвыкладзенага ПРАШУ:

1. Высьветліць і паведаміць прычыну майго затрыманьня;

2. Высьветліць і паведаміць мне асобаў, якія ўдзельнічалі ў гэтым;

3. Правесьці праверку па факце, выкладзеным у дадзенай скарзе, даць прававую адзнаку дзеяньням супрацоўнікаў міліцыі;

4. Далучыць да ўстаноўленай законам і нарматыўнымі дакументамі МУС адказнасьці вінаватых у парушэньнях супрацоўнікаў міліцыі;

5. Праінфармаваць мяне ў прадугледжаныя законам тэрміны аб выніках праведзенай праверкі і прынятых мерах па пакараньні вінаватых з пазначэньнем ці прадстаўленьнем копіяў распарадчых дакументаў УУС ці іншых органаў, якія пацьвердзяць прыцягненьне вінаватых да адказнасьці;

6. Вярнуць мне рэчы, якія засталіся ў Першамайскім РУУСе, – піша Наста Палажанка ў скарзе.

# Па 700 тысячаў штрафу – за бел-чырвона-белыя сьцягі

Некалькі прадстаўнікоў дэмакратычных сілаў Віцебску 2 лістапада прайшлі па горадзе з бел-чырвона-белымі сьцягамі, сьцягам створанай партыі БХД і руху "Маладая Беларусь".

Самы вялікі сьцяг памерам 2 на 8 метраў нёс сябра Кансерватыўна-Хрысьціянскай Партыі БНФ Сяргей Каваленка. "Гэта было шэсьце да Дзядоў – па цэнтры гораду, каб як мага больш людзей пра Дзяды даведалася. Мы ішлі да плошчы Свабоды, нам сігналілі машыны, мінакі даганялі, каб сфатаграфаваць на мабільнікі. Людзям падабалася – кажа Сяргей Каваленка".

Актывісты прайшлі ад Летняга амфітэатру да ратушы па правым баку вуліцы, потым перайшлі на супрацьлеглы бок і сталі вяртацца да плошчы Свабоды. Недалёка ад будынку гарвыканкаму іх дагнала міліцэйская машына. Сяргея Каваленку і Тараса Сургана, які таксама трымаў у руках бел-чырвона-белы сьцяг, міліцыянты затрымалі і завезьлі ў Кастрычніцкі РАУС.

На затрыманых Каваленку і Сургана склалі пратакол за арганізацыю і правядзеньне несанкцыянаванай грамадзкай акцыі. Абодва актывісты ўжо неаднаразова былі асуджаныя за выкарыстаньне бел-чырвона-белых сьцягоў падчас акцыяў у Віцебску і Гарадку.

3 лістапада ў віцебскім раённым судзе разглядаліся адміністрацыйныя справы супраць Сяргея Каваленкі і Тараса Сургана, якія 2 лістапада былі затрыманыя за ўдзел у несанкцыянаванай акцыі. Судзьдзя Эдгар Мартырасян аштрафаваў віцебскіх актывістаў Тараса Сургана і Сяргея Каваленку – на 20 базавых велічыняў кожнага – за правядзеньне несанкцыянаванай акцыі з выкарыстаньнем нацыянальных сьцягоў.

## Арыштавалі... за дабрачынныя абеды

**15 лістапада берасьцейскія міліцыянты затрымалі Аляксандра Казьлянку і яго дзяўчыну. Маладыя людзі зладзілі дабрачынны абед бяздомным. У Аляксандра Казьлянкі забралі пашпарт. На абодвух быў складзены пратакол. Маладыя людзі зьвярнуліся ў Берасьцейскае аддзяленьне БХК.**

**"Да маладых людзей падышоў участковы, які не назваўся, адразу перайшоў на "ты". З ім быў чалавек у цывільным. Ён таксама не назваў імя. Таксама задаваў пытаньні, камандаваў міліцыянту, што яму трэба рабіць", – распавёў сябра камітэту Валянцін Лазарэнкаў.**

**Па словах В. Лазарэнкава, брэсцкія пацыфісты праводзяць гэтую акцыю на працягу 5 гадоў. У той дзень яны пасьпелі пакарміць 15 чалавек. У маладых людзей быў з сабой плакат з малюнкам самалёта, які замест бомбаў скідае людзям ежу. На думку супрацоўнікаў міліцыі Ленінскага РАУС, кармленьне бяздомных можа разглядацца як несанкцыянаваны пікет.**

# Абмеркаваньню не падлягае...

Рашэньне пра будаўніцтва АЭС – палітычнае і абмеркаваньню не падлягае. Пра гэта паведамляецца ў адказах на скаргі, якія беларускія грамадзяне атрымліваюць з Міністэрства энергетыкі.

Раней некалькі сотняў беларусаў накіравалі ў Міністэрства энергетыкі лісты з патрабаваньнем адмяніць будаўніцтва АЭС у Астраўцы з прычыны эканамічнай немэтазгоднасьці і неаб'ектыўнай ацэнкі ўзьдзеяньня АЭС на навакольнае асяродзьдзе, якая значна недаацэньвае экалагічную небясьпеку.

"Прапанаваны праект АЭС-2006 з рэактарамі ВВЭР-1200 – неправераны (у сьвеце дзейнічае толькі два рэактары такога тыпу), ненадзейны (як паказала эксплуатацыя АЭС "Цяньвань" у Кітаі і падобных па канструкцыі рэактараў ВВЭР-440 і ВВЭР-1000 у розных краінах), а электраэнергія, якая на ім выпрабляецца – празьмерна дарагая (21 цэнт ЗША за 1 кВт*г па сьцьверджаньні расейскага боку)", – пішуць у зваротах грамадзяне.

"Заява пра магчымае ўзьдзеяньне на навакольнае асяродзьдзе беларускай АЭС" павінна быць адкліканая заказчыкам, бо дапушчаныя ў "Заяве" памылкі ня могуць быць ліквідаваныя ў аператыўным парадку і носяць прынцыповы і нават канцэптуальны характар, а таксама ў Заяве цалкам адсутнічаюць шмат якія важныя разьдзелы і, у цэлым, "Заява" не адпавядае патрабаваньням, якія ўтрымліваюцца ў Інструкцыі аб парадку правядзеньня ацэнкі ўздзеяньня на навакольнае асяродзьдзе планаванай гаспадарчай і іншай дзейнасьці ў Рэспубліцы Беларусь, зацьверджанай Пастановай №30 Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяродзьдзя Рэспублікі Беларусь ад 17 чэрвеня 2005 году" – гаворыцца ў скаргах.

Свае патрабаваньне аўтары матывуюць спасылкамі на "Крытычныя заўвагі да "Заявы аб магчымым узьдзеяньні на навакольнае асяродзьдзе беларускай АЭС", падрыхтаваныя Беларускай партыяй "Зялёныя"; рухам "Навукоўцы за бязьядзерную Беларусь"; групай "Экаабарона!" (Расія); ГА "Экадом" (Беларусь), навуковыя манаграфіі і афіцыйныя дакументы.

У адказе Мінэнергетыкі палемізуе з аўтарамі скаргаў, прыводзячы довады на карысьць будаўніцтва АЭС, і паведамляе, што рашэньне пра будаўніцтва АЭС было прынятае ў студзені 2008 году Саветам Бясьпекі Рэспублікі Беларусь з улікам эканамічных, экалагічных і сацыяльных наступстваў такога рашэньня. Але галоўны довад міністэрства ўтрымліваецца ў канцы адказу: "Зьвяртаем Вашую ўвагу, што палітычнае рашэньне пра будаўніцтва атамнай электрастанцыі ў Рэспубліцы Беларусь прынятае, і не зьяўляецца тэмай цяперашніх грамадзкіх абмеркаваньняў", – гаворыцца ў адказе.

Іншымі словамі, уладам напляваць на меркаваньне грамадзянаў адносна будаўніцтва АЭС, мэтазгоднасьць якога зьяўляецца як мінімум спрэчнай.

Зрэшты, з грамадзкасьцю ў пытанні будаўніцтва АЭС і раней не раіліся. Так на "грамадзкія слуханьні" па АЭС у Астраўцы, якія праходзілі ў пачатку кастрычніка, не былі прапушчаныя прадстаўнікі шмат якіх незалежных экалагічных і праваабарончых арганізацыяў. Замест гэтага зала была запоўненая пабочнымі людзьмі. Кожнаму з іх былі ўручаныя сьцяжкі і плакаты, якія агітавалі за будаўніцтва АЭС. Сам будынак, дзе праходзілі слуханьні, быў ачэплены АМАПам, уезды ў горад былі перакрытыя міліцыяй. А расейскі эксьперт-эколаг Андрэй Ажароўскі быў арыштаваны пры спробе пранесьці ў будынак дакументы, якія крытыкуюць афіцыйны даклад аб узьдзеяньні на навакольнае асяродзьдзе, і асуджаны да сямі сутак арышту па ілжывым абвінавачаньні ў "дробным хуліганстве".

# Шэсьце ў Курапаты...

(Пачатак на стар. 1)

Цягам трох гадзінаў удзельнікі акцыі ішлі павольным крокам па прасьпекце Незалежнасьці, вуліцах Каліноўскага, Сядых, Карбышава, Гамарніка і Міраншічэнкі ва ўрочышча Курапаты. Над калонай з прыкладна тысячы чалавек луналі ня менш за сотню нацыянальных бел-чырвона-белых сьцягоў, сьцягоў "Еўрапейскай Беларусі", Маладога Фронту і Партыі БХД. Пры гэтым практычна кожны ўдзельнік нёс маленькія нацыянальныя сьцяжкі альбо на вопратцы былі павязаныя бел-чырвона-белыя стужкі. Шэсьце, безумоўна, прыцягнула ўвагу: мінакі спыняліся, з крамаў выбягалі паглядзець, што адбываецца, як пакупнікі, так і прадаўцы, аўтамабілі сігналілі ў знак салідарнасьці.




На чале калоны несьлі драўляныя крыжы, якія пазьней былі ўсталяваны ў Курапатах. Былі разгорнутыя транспаранты з надпісамі "Ушануем ахвяраў Курапат" і "Дзяды". Актывісты "Еўрапейскай Беларусі" несьлі транспарант "НЕ – палітычнаму тэрору", а таксама велізарную расьцяжку "1937-2009", на якой былі намаляваны з аднаго боку – Іосіф Сталін і супрацоўнік НКУС, які страляе ў патыліцу зьняволенаму; а з іншага боку – Аляксандр Лукашэнка і амапавец, які зьбівае дручком дэманстранта. На чале калоны разам з лідэрамі КХП БНФ ішла дачка рэпрэсаванага беларускага паэта Тодара Кляшторнага Мая Кляшторная, якая, нягледзячы на сталы ўзрост, штогод ідзе пешшу ў Курапаты, каб ушанаваць памяць ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў.

Удзельнікаў акцыі цягам усяго шэсьця суправаджалі супрацоўнікі міліцыі ў цывільным. За шэсьцем назіралі супрацоўнікі РУУС адразу некалькіх раёнаў Менску, акцыю фіксавалі на відэа многія супрацоўнікі ГУУС Менгарвыканкаму і сьпецслужбаў. Крочылі па ходзе калоны і супрацоўнікі ДАІ, якія ў сувязі з тым, што мерапрыемства дазволена Менгарвыканкамам, былі абавязаны забясьпечваць парадак яго правядзеньня і бесперашкодны праход дэманстрантаў па заяўленым маршруце.

Ва ўрочышчы Курапаты, куды дэманстранты прыйшлі ў 14.30, іх таксама чакалі супрацоўнікі міліцыі ў форме і цывільным, а таксама кіраўніцтва ГУУС Менгарвыканкаму. Нягледзячы на тое, што акцыя дазволена менскімі ўладамі, яе арганізатарам не дазволілі пранесьці на месцы правядзеньня мітынгу гукаўзмацняльную апаратуру. Лідэры КХП БНФ назвалі дзеяньні супрацоўнікаў міліцыі незаконнымі.

Беларускія ўлады дагэтуль афіцыйна не прызналі, што ў Курапатах расстрэльвалі ахвяраў сталінскага рэжыму. Больш за тое, міліцыя адмаўляецца ахоўваць мемарыял, і ва ўрочышчы ўвесь час адбываюцца акты вандалізму, за якія ніхто не нясе адказнасьці.

У Курапатах удзельнікі акцыі ўсклалі кветкі да Крыжа Пакут і выканалі гімн "Магутны Божа". Тут прайшоў мітынг, падчас якога выступілі сваякі рэпрэсаваных беларусаў, апазіцыйныя палітыкі, грамадзкія дзеячы, гісторыкі.

# Алег ВОЎЧАК: "Факт фальсіфікацыяў выбараў нікім не адмаўляецца…"

Генеральная пракуратура не знайшла прыкметаў фальсіфікацыі выбараў – пра гэта гаворыцца ў адказе на зварот групы беларускіх апазіцыйных палітыкаў і грамадзкіх дзеячаў з патрабаваньнем узбудзіць крымінальную справу па факце заявы Аляксандра Лукашэнкі аб фальсіфікацыі вынікаў галасаваньня на прэзідэнцкіх выбарах 2006 году. Зварот быў перададзены ў Генпракуратуру 24 кастрычніка. Юрыст Алег Воўчак называе "звычайнай адпіскай" адказ генпракурора Рыгора Васілевіча на "зварот 50-ці".

Воўчак сьцьвярджае, што высновы аб наяўнасьці злачынства ці адсутнасьці такога робяцца на падставе дакументаў, а не галаслоўна. Сам факт фальсіфікацыяў на выбарах, між тым, ніхто не адмаўляе.

"У адпаведнасьці з артыкулам 174 Крымінальна-працэсуальнага кодэксу, Генпракуратура павінна была альбо ўзбудзіць крымінальную справу па заяве, або адмовіць ва ўзбуджэньні крымінальнай справы ў выглядзе пастановы аб адмове, альбо даць адказ, што гэтая заява накіроўваецца для разгляду іншаму органу па падсьледнасьці. Нічога гэтага Генпракуратура не зрабіла. Замест гэтага Васілевіч даслаў звычайны ліст, які складзены без апытаньня як грамадзянаў, якія падпісаліся пад зваротам, так і без апытаньня Ярмошынай, Лукашэнкі, і, перш за ўсё, чальцоў цяперашняга складу Цэнтральнай выбарчай камісіі. Спачатку пракуратура абавязаная была запатрабаваць усе дакументы па выбарах, якія маюцца, апытаць усіх зацікаўленых службовых асобаў у гэтай справе і толькі на падставе гэтага ўжо рабіць выснову: ёсьць злачынства ці няма злачынства", – заявіў праваабаронца ў інтэрв'ю "Беларускаму партызану".

Пры гэтым Воўчак адзначае: "Факт фальсіфікацыяў нікім не адмаўляецца – значыць, трэба было ўзбуджаць крымінальную справу і ў межах крымінальнай справы расьсьледаваць прыведзеныя факты. Гэтую справу нельга пакідаць. Падпісанты "звароту 50-ці" маюць права зьвярнуцца ў суд – бо ў гэтай справе прысутнічаюць прыкметы службовага злачынства – 426 артыкул (перавышэньне ўлады, службовых паўнамоцтваў). Праз суд трэба дамагчыся, каб пракуратура правяла дадатковую праверку паводле іх заяваў. У прэзідэнта няма паўнамоцтваў даваць даручэньні


Алег ВОЎЧАК.

пераглядаць адсоткі галасаваньня выбаршчыкаў"

Праваабаронца ўпэўнены, што напярэдадні двух новых выбарчых кампаніяў, дэмакратычная грамадзкасьць павінна дамагчыся, каб Лідзія Ярмошына і ўвесь цяперашні склад Цэнтрвыбаркаму былі адхіленыя ад выкананьня такой важнай функцыі, паколькі Лукашэнка неаднаразова заяўляў, што выбары былі сфальсіфікаваныя і ў гэтым прымалі ўдзел службовыя асобы Цэнтрвыбаркаму.

"У дзеяньнях належных асобаў Цэнтрвыбаркаму таксама бачацца прыкметы злачынства 426 артыкулу (перавышэньні ўлады), паколькі яны вынікі выбараў падпісвалі. А генпракурор такім адказам, атрымліваецца, схаваў усе парушэньні закону і ў будучыні можа апынуцца пад крымінальнай адказнасьцю за наўмыснае насуперак інтэрасам службы невыкананьне службовай асобай дзеяньняў, якія яна павінна была і магла зьдзейсьніць з прычыны ўскладзеных на яе службовых абавязкаў, спалучанае з прычыненьнем істотнай шкоды правам і законным інтарэсам грамадзянаў і грамадзкім інтарэсам.

А каб праверыць і пацьвердзіць, што Рыгор Васілевіч не праводзіў ніякай праверкі, хай бы дзесяць, а то і больш падпісантаў схадзілі ў пракуратуру і азнаёміліся з матэрыяламі праверкі. І калі ў гэтых матэрыялах будзе толькі заява грамадзянаў, яшчэ раз гэта пацьвердзіць, што ніякай аб'ектыўнай, усебаковай і поўнай праверкі не праводзілася. А закон жа аб звароце грамадзянаў абавязвае любога чыноўніка правяраць усе довады, пра якія заяўляюць грамадзяне", – сказаў Алег Воўчак.

## Васілевіч ня стаў выклікаць Лукашэнку на допыт

**Генпракуратура ня мае інфармацыі пра скажэньне вынікаў прэзідэнцкіх выбараў 2006 году. Як паведамляе БелаПАН, у адказе на зварот групы беларускіх апазіцыйных палітыкаў і грамадзкіх дзеячаў пра тое, што Лукашэнка сфальсіфікаваў вынікі прэзідэнцкіх выбараў, гаворыцца: Генеральная пракуратура не валодае дакументальнымі дадзенымі пра скажэньне вынікаў прэзідэнцкіх выбараў 2006 году.**

**У лісьце, падпісаным генеральным пракурорам Рыгорам Васілевічам, таксама заяўляецца "пра адсутнасьць дадзеных пра нейкія іншыя парушэньні палажэньняў Выбарчага кодэксу, дапушчаныя пры падліку галасоў і абвяшчэньні вынікаў выбараў".**

**Зварот групы апазіцыйных палітыкаў і грамадзкіх дзеячаў з патрабаваньнем узбудзіць крымінальную справу па факце заявы Аляксандра Лукашэнкі пра фальсіфікацыю вынікаў галасаваньня на прэзідэнцкіх выбарах 2006 году быў перададзены ў Генпракуратуру 24 кастрычніка.**

**Сярод тых, хто падпісаўся пад зваротам – экс-кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін, старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька, былы старшыня Вярхоўнага Савету Мечыслаў Грыб, рэжысёры Віктар Дашук і Юрый Хашчавацкі, прафсаюзныя лідэры Аляксандр Ярашук і Аляксандр Бухвостаў, палітыкі Сяргей Калякін, Вінцук Вячорка, Мікалай Статкевіч, Віктар Івашкевіч, Яраслаў Раманчук і іншыя.**

**Падставай для звароту сталі выказваньні Аляксандра Лукашэнкі, апублікаваныя 27 жніўня ў расейскай газеце "Известия": "За мяне на апошніх выбарах прагаласавала, да ведама, 93%. І я прызнаўся пасьля, калі на мяне проста пачалі ціснуць, што мы фальсіфікавалі выбары. <…> Я аддаў каманду, каб не 93% было, а дзесьці там 80, я ня памятаю, колькі. Бо за 90% – гэта ўжо псіхалагічна не ўспрымаецца. Але гэта была праўда".**

**"Гэта ўжо другое публічнае прызнаньне ў фальсіфікацыі вынікаў галасаваньня, зробленае Аляксандрам Лукашэнкам, таму яго словы ня могуць заставацца без рэакцыі грамадзкасьці, праваахоўных органаў Беларусі і міжнароднай супольнасьці", – гаворыцца ў звароце.**

**"Мы прасілі правесьці расьсьледаваньне па факце канкрэтнай заявы, зробленай Лукашэнкам, – адзначыў Анатоль Лябедзька. – Васілевіч абавязаны запрасіць Лукашэнку і ўзяць у яго тлумачэньні, каму, калі і з якой мэтай ён аддаваў распараджэньне зьмяніць выніковыя лічбы галасаваньня. На жаль, гэтага зроблена не было. Гэта дае падставы сьцьвярджаць, што ў 2010-2011 гадах у Беларусі вынікі галасаваньня на мясцовых і прэзідэнцкіх выбарах зноў будуць сфальсіфікаваныя".**

"Права на волю". Праваабарончы бюлетэнь. Выходзіць два разы на месяц на беларускай і рускай мовах.
Наклад 299 асобнікаў. Пры перадруку спасылка на бюлетэнь абавязковая.